225710

г. Пінск, ІПД, 35

Тел: 35-50-65
Факс: 35-05-36
Эл. адрас: CRBPINSK@TUT.BY

Складальнік,
камп'ютарны набор і афармленне: Л.І. Папіціч

Адказны за выпуск А.І. Анташук

Пінская РЦБС

Літаратурная спадчына
Піншчыны



# Немагчыма чалавеку без веры

60-годдзю
з дня нараджэння
прысвячаецца

“На вейках сняжок растае…”

Ой, пайду, я ды ў чыстае поле,
У завею, у ноч, у мароз,
Каб пазбыцца нясцерпнага болю,
Каб не бачыў ніхто маіх слёз.

Не баюся, што холадна, позна…
Буду доўга ў начы бедаваць,
Каб душу абязболіць марозам
І завеямі забінтаваць…

На світанні вярнуся дадому
Увесь як згорнуты парасон…
Можа зніме пакуты мне стома,
Як збавенне ахутае сон…

Зіновій Прыгодзіч



# Літаратура аб жыцці і творчасці Зіновія Прыгодзіча


1. **Гарэлік, Л.М.** Прыгодзіч Зіновій Кірылавіч /Л.М. Гарэлік//Беларускія пісьменнікі: біябібліяграфічны слоўнік. У 6 т./ Ін-т імя Я. Купалы АН Рэспублікі Беларусь. Энцыкл.; пад рэд. А.В.мальдзіса. Мінск, 1995.
2. **Гришковец,** В. Родник у лесных берёз или Ночь заканчивается воскресением: о книге З. Пригодича “Родник у лесных берёз”/ В. Гришковец//Заря.-2-13.-23 мая.
3.**Лазоўскі, С.** Айчыну сілкуюць асобы: [аб кнізе З.Прыгодзіча “Постаці”] / Сяргей Лазоўскі // Полымя. 2012. №1. С.176-178.
4.**Лешніца, К.** Асобы нацыянальнай культуры: [прэзентацыя кнігі З.Прыгодзіча “Постаці” у Нацыянальнай бібліятэцы Рэспублікі Беларусь] // Звязда. 2012. 17 сакавіка.
5.**Марціновіч, А.** Сэрца сэрцу голас падае: [аб кнізе З.Прыгодзіча “Постаці”] / Алесь Марціновіч // Рэспубліка. 2012. 19 студзеня.
6.**Савік, Л.С.** Прыгодзіч Зіновій Кірылавіч / Л.С.Савік// Беларуская энцыклапедыя: у 18 т. / рэдкал.: Г.П.Пашкоў і інш. Мінск, 2001. Т. 13.С.60.
7.**Слуцкий, В.**[рец. на книгу З.Пригодича “Постаці”] / Василь Слуцкий // Неман. 2012. №1. С.223.



*Так случилось, что писателя Зиновия Пригодича я узнал довольно рано и, можно сказать, по первым его произведениям. Правда, познакомиться с ним лично удалось совсем недавно, на II съезде Союза писателей Беларуси, который состоялся в октябре прошлого года. Самое интересное, что именно таким я и представлял себе писателя, читая в далеких уже 70-х – 80-х годах минувшего столетия повести и рассказы Зиновия Пригодича. Дело в том, что свои первые шаги в литературе и журналистике он сделал в пинской газете «Полесская правда», которая, кстати, дала путевку в большую литературу и другой нашей славной землячке – поэтессе Евгении Янищиц. В этой газете посчастливилось и мне вкусить первого литературного хлеба. И не только литературного – в середине 70-х я некоторое время работал в «Полесской правде» в должности корреспондента, причем не менее года – в отделе сельского хозяйства. А это значит, Пинщину с молодых лет я, что называется, исколесил вдоль и поперек. Не раз довелось бывать и в родной деревне Зиновия Пригодича – Лыще, в соседних Заборовцах, Доброславке, Мокрой Дубраве… Какие названия, а?.. Такие же, скажу вам, и места – живописные, колоритные, самая что ни есть глубинка Западного Полесья!..*

**Нельзя человеку без веры**

Помню, сколько раз всплывало в разговорах сотрудников «Полесской правды» имя Зиновия Пригодича… Не однажды и мне приводили его в пример. Ведь тогда, в 70-х – 80-х, ни одна сколь-нибудь серьезная публикация любого писателя не оставалась в стороне от обсуждения не то что в редакционных кабинетах – в любой мало-мальски образованной компании. Читали буквально ВСЕ и буквально ВСЁ! А тут – писатель-земляк, кто еще недавно, каких-то лет 7-8 тому, бывал в этих вот кабинетах, заходил сюда на правах и автора, и товарища, и друга…

Все это вспомнилось невольно, как только взял в руки книгу Зиновия Пригодича «Родник у лесных берез» – повесть, эссе, рассказы, миниатюры, интервью (перевод с белорусского автора). Повесть «Ночь перед воскресением» я читал когда-то по-белорусски, потому начал читать книгу с конца – с миниатюр. Если бы и не знал, что писатель и журналист Зиновий Пригодич – кандидат философских наук, это сразу же почувствовал бы, читая его миниатюры. В книге они помещены под общим названием «Васильки». Скажу прямо, будь моя воля, я включил бы гораздо больше этих, по-моему, удивительно тонких и глубоких, как по стилю, так и по содержанию, произведений. В них Зиновий Пригодич как раз и предстает перед читателем истинным философом, человеком сколь наблюдательным, столь умным и глубоким, я бы сказал, мудрым повествователем:

*«Любовь для человека как солнце. Тепло его чувствуешь даже на расстоянии».*

Или вот еще:

*«Человек, который любит, но не встретил взаимности, похож на того журавля, что выбился из сил, отбился от стаи, остался один среди серых, унылых болотных кочек, один на один со своей болью, жгучей обидой, со своей горькой и надрывной песней…».*

А вот еще. По моему мнению, эта миниатюра, говоря образно, томов премногих тяжелей:

*«Важный – в районном масштабе – начальник долго ходил вокруг участковой больницы, рассматривал ее со всех сторон. Наконец хмуро, недовольно сказал главному врачу:*

*– Плохо.*

*Тот вздохнул:*

*– Сам знаю, что плохо. Крыша течет, подвалины подгнили. В палатах сыро, темно. А денег на ремонт, сколько ни просил, не дают. Говорят: скоро будем строить новую.*

*– Я не про то, – перебил недовольно начальник. – Плохо, что нет наглядной агитации. Хотя бы над входом какой-нибудь плакат повесили»…*

Можно много еще цитировать, зафиксированные в миниатюрах, наблюдения писателя и философа, но главное – Человека и Гражданина Зиновия Кирилловича Пригодича. Помните у Некрасова: «Поэтом можешь ты не быть, но гражданином быть обязан»? Таким вот ГРАЖДАНИНОМ и предстает в своей книге, о чем бы ни говорил нам Зиновий Пригодич. Человеком неравнодушным, болеющим за СВОЕ и НАШЕ, за ОТЧИЗНУ и РОДИНУ. Но, разумеется, и писателем, хорошим, вдумчивым прозаиком, ярким и страстным публицистом.

В этом еще раз убеждаешься, читая рассказы, помещенные в книге: «Бультерьеры», «Вечерний выстрел», «А там будет видно…»,

# Сэрца сэрцу голас падае

Алесь МАРЦІШОВІЧ

**Пісьменнік, журналіст, навуковец, кандыдат філасофскіх навук Зіновій Прыгодзіч парадаваў сваёй новай кнігай «Постаці: З цэлым народам гутарку весці...», якая выйшла ў рэдакцыйна-выдавецкай установе «Літаратура і мастацтва». Кніга гэтая адметная ўжо тым, што змест яе склалі творчыя партрэты вядомых дзеячаў беларускай культуры. Але непаўторнасць яе, адрознасць ад іншых выданняў, у якіх апавядаецца пра тых, чые імёны на слыху, на гэтым не спыняецца. У Зіновія Прыгодзіча не традыцыйныя артыкулы, міні-даследаванні, як гэта бывае, а гутаркі з тымі, пра каго ён узяўся расказаць.**

Дзесяць постацяў, што паўстаюць на старонках кнігі (дарэчы, гэта толькі частка гутарак Зіновія Прыгодзіча, апрабаваных на старонках старэйшага літаратурна-мастацкага часопіса краіны «Полымя»), — не проста дзесяць творчых партрэтаў, а і сяганне ў сферу прыгожага, узвышанага, вабнага.

Першай у кнізе ідзе гутарка з Валерыем Анісенка (каб не абцяжарваць чытача звесткамі, не буду называць усе рэгаліі, узнагароды Валерыя Данілавіча, такога ж прынцыпу буду прытрымлівацца і ў іншых выпадках) «Тэатр пачынаецца ... з Радзімы!». Трапна і да месца ў крыху змененым выглядзе ўспрымаецца вядомае выказванне Канстанціна Станіслаўскага. Знакамітая актрыса Марыя Захарэвіч сутнасць сваёй працы выказала на дзіва афарыстычна: «Навошта той талент, калі няма сэрца...» За літаратуру, за народ беларускі, за Беларусь балела і сэрца Янкі Сіпакова (на жаль, ужо амаль год Івана Данілавіча няма з намі).

Ягоныя развагі «Гэта ж якая радасць — ствараць жыццё!» — даверлівая споведзь адкрытай душы. У іх шмат цеплыні, сардэчнасці. Яно і не дзіўна: Сіпакоў і Прыгодзіч сябравалі, таму душа душы, сэрца сэрцу і падае свой голас.

Як зорка зорцы ў вядомым перакладзе Аркадзя Куляшова аднаго з вершаў Міхаіла Лермантава.

Дый выраз «душа душы голас падае», па сутнасці, стасуецца да ўсіх матэрыялаў кнігі. Кожнага са сваіх субяседнікаў Зіновій Прыгодзіч змог належным чынам разгаварыць і з кожным у размове ён паўстае на роўных бо добра ведае творчасць тых, пра каго расказвае. Таму такімі запамінальнымі паўстаюць Міхась Дрынеўскі, Леанід Захлеўны, Адам Мальдзіс, Іван Міско, Георгій Паплаўскі, Анатоль Сульянаў. І кожны з іх становіцца нам яшчэ больш блізкім і дарагім, бо ўжо добра ведаеш яго не толькі як творцу, але і як чалавека.

Пра гутарку ж «Шчасце — калі здзяйсняюцца мары» скажу колькі слоў асобна, бо герой яе — чалавек, якога мы сёння ўсё часцей згадваем; калі ўспамінаем класіка беларускай літаратуры Якуба Коласа. Нястомны,' няўрымслівы чалавек, як кажа пра яго Зіновій Прыгодзіч, і гэта праўдзіва, Міхась Міцкевіч — сам па сабе асоба, што і відаць з матэрыялу. А яшчэ Міхась Канстанцінавіч на дзіва шмат рупіцца аб прапагандзе творчасці свайго знакамітага бацькі. Увогуле, Міхась Міцкевіч — гэта сапраўдны інтэлігент, а сапраўдны інтэлігент той...

Чытайце кнігу Зіновія Прыгодзіча «Постаці», і вы знойдзеце адказ на гэтае пытанне. Як і на іншыя, спасціжэнне сутнасці якіх дазваляе заўсёды і ва ўсім заставацца не проста чалавекам, а асобай.

*// Рэспубліка-2012.-19 студзеня*



# Зиновий Пригодич-
# главный редактор журнала "Гаспадыня"




«Гаспадыня — семейный журнал» выходит с 1992 года, на русском и белорусском языках, объемом в 48 полноцветных страниц, тиражом свыше 70 тысяч экземпляров.

Как уже видно из названия, журнал предназначен для семьи — каждый находит в нем то, что ему интересно. Главу семьи, например, заинтересует прежде всего раздел «Наш дом», в котором содержится немало интересных подсказок для мужской работы. Хозяйка дома найдет полезными разделы «Сад и огород», «Барбара», «Рукодельница».

Очень популярен у наших читателей (об этом мы судим по их письмам) раздел «Здоровье» и в особенности материалы под рубрикой «Проверено на себе». На протяжении уже многих лет читатели обмениваются проверенными на себе средствами и методами избавления от различных хворей и недомоганий. Порой рецепты бывают совершенно неожиданные, но, как показывает практика, весьма эффективные.

В журнале широко публикуются также материалы, посвященные нравственным и духовным проблемам семьи, личности. Есть литературная и развлекательная страницы, а также страничка для детей.

Словом, мы стараемся делать журнал не только полезным, но и интересным, чтобы каждому в семье он пришелся по душе.

Зиновий Пригодич

# Достижения Зиновия Пригодича

Награжден медалью «За трудовую доблесть», Почетной грамотой Верховного Совета Республики Беларусь. Заслуженный журналист БСЖ. Отличник печати Беларуси. Лауреат премии «Золотое перо». В творческом багаже писателя – более десятка художественных и документальных книг. Кандидат философских наук, доцент. Член Правления Союза писателей Беларуси.




Почетные знаки-символы «Золотой Купидон» и дипломы были вручены победителям республиканского литературного конкурса «Лучшее произведение 2011 года». в номинации «Критика и литературоведение» триумфатором стал Зиновий Пригодич – за творческие портреты деятелей белорусской литературы и культуры.



# Лёс пісьменніка



Нарадзіўся 15 кастрычніка 1944г. у в.Лышча Пінскага раёна.

Член Саюза беларускіх пісьменнікаў з 1986г. Кандыдат філасофскіх навук, дацэнт. Піша на беларускай і рускай мовах. Узнагароджаны медалём «За працоўную доблесць» (1981) і Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь (1995). Заслужаны журналіст БСЖ (2002).Скончыўшы сярэднюю школу (1960), два гады працаваў у Лагішынскай раённай газете "Калгасная праўда". Вучыўся ў БДУ, атрымаў дыплом журналіста і з 1966 па 1977г. працаваў у газете "Звязда", літсупрацоўнікам, загадчыкам аддзела. Пасля амаль пяць год (1977 - 1981) быў на партыйнай рабоце - інструктар аддзела культуры, памочнік сакратара ЦК КПБ. Вучыўся ў Акадэміі грамадскіх навук пры ЦК КПСС (1981 1984), пасля заканчэння якой працаваў загадчыкам кафедры журналістыкі, мовы і літаратуры Мінскай ВПШ.

Са студзеня 1989г. - намеснік загадчыка ідэалагічнага аддзела ЦК КПБ, а са жніўня гэтага ж года - рэдактар газеты «Советская Белоруссня». З 1992г. - галоўны рэдактар часопіса «Гаспадыня». У 1996 - 1999 гг. - першы намеснік старшыні Дзяржкамдруку Рэспублікі Беларусь.
Друкавацца пачаў у 1957г., выступаючы ў раённым, абласным і рэспубліканскім друку, калектыўных зборніках з вершамі і лірычнымі замалёўкамі. Першае апавяданне надрукаваў у Пінскай раённай газете «Палеская праўда» (1963). Творчыя інтарэсы пісьменніка засяроджаны на востранадзённых праблемах сучаснасці.





Піша нарысы, дакументальныя аповесці, навелы, апавяданні, лірычныя мініяцюры. Выступае з крытычнымі артыкуламі, у якіх аналізуюцца пытанні развіцця сучаснай беларускай літаратуры.

Першая кніга «Добры дзень, сад!» выдадзена ў 1974г. Праз два гады (1976) пабачыла свет дакументальная аповесць «Строгая дабрата», а яшчэ праз год (1977)-дакументальная аповесць «Крылы дужэюць у палёце». У 1979 годзе выйшаў зборнік нарысаў “Жменя зярнят”.




Мастацкая аповесць «Журавы на далёкай пойме» (1984) прысвечана студэнцкай моладзі, станаўленню іх інтымных і грамадзянскіх пачуццяў. Праблемы сучаснай вёскі, складаныя сямейныя калізіі, узаемаадносіны бацькоў і дзяцей, прыгажосць свету людзей старэйшага пакалення раскрываюцца ў аповесці «Ноч перад нядзеляю» (1985). Гэтыя ж праблемы даследуюцца і ў кнізе лірычнай прозы «Журба мая светлая» (2002).

Апошнім часам пісьменнік зноў адчуў цягу да паэтычных жанраў. Ім апублікаваны ў рэспубліканскіх часопісах нізкі вершаў, паэма «Кукавала зязюля». Выйшаў зборнік вершаў «Калі б не ты» (2002).





# На словы Зіновия Прыгодзіча паkладзена музыка



**НЕ ПРЫЕДЗЕ…**

Дожджык сее спорна, густа
З адзінокай хмары, рванай…
Як няўтульна мне і пуста
Без каханай, без каханай!!

Папрасіў я ветрык ранні
Для тае, каго кахаю,
Перадаць маё пасланне:
“Я чакаю! Я чакаю!..”

І над лесам, над далінай
Угары пачуўся недзе
Крык самотны, жураўліны:
“Не прыедзе… Не прыедзе…”

**ГЭТАЙ НОЧЧУ**

Гэтай ноччу ты снілася мне-
Як зашсёды, прыгожай, вясёлай.
Я цябе цалаваў у тым сне,
І смяялася неба вясёлкай.

І зіхцелі ўсе кветкі, кусты,
І быў свет трапяткі, асаблівы-
Гэтай ноччу мне снілася ты.
Гэтай ноччу я быў шчаслівы…

Зіновій Прыгодзіч



# Вёска Лышча

## легенды

Кажуць, жыў калісьці на Піншчыне паляўнічы. Аднойчы за-браўся ён у такі гушчар, што і выбрацца не змог. Прытаміўся, а туг ноч настала. Дабраўся ён неяк да паляны і заснуў. Калі ж прачнуўся, то не мог надзівіцца прыгажосцю гэтага месца. Не-далёка —: блакітная стужачка рэчкі, на ўскрайку лесу — крынічка, зелянеў луг, зіхацелі кветкі. Яшчэ далей раскінулася балота. Доўга не мог паляўнічы забыць гэта месца. І ў хуткім часе перабраўся сюды з сям'ёй.

Прайшлі гады. Побач з зямлянкай паляўнічага выраслі іншыя. Нарадзілася паселішча. Трапіў неяк сюды пан. Убачыў ён тутэй-шых сялян і здзівіўся

— Ну і галішча тут, галішча!

Так і замацавалася гэта назва за вёскай. З цягам часу «га» ад-пала, і вёска пачала называцца Лышча.

---



Некалі, даўным-даўно, гэта былі дзіўныя і страшныя мясціны. Там, дзе цяпер вёска, на дзесяткі вёрст навокал распасціралася глухая непраходная багна. Да самага балота падступалі змрочныя, дрымучыя лясы. Такія густыя, што нават хуткаплынная рака Вісліца выгіналася вужакаю, каб прабіцца да вялікай вады. Ніколі не чуў тут ніхто чалавечага голасу. Толькі вылі па начах воўчыя зграі, глуха рыпелі пад ветрам выгоністыя старыя сосны, уладарна шумелі дубы.



Ды аднойчы прыйшлі людзі. Не ад лёгкага жыцця прыбіліся яны ў гэты куток. Бунтарныя сэрцы шукалі сабе волі і шчасця.

Далей ісці не было куды — балота. Іржавая бясконцая вада з асакой і лазой. Нехта нявесела прысвіснуў:

— Ну і лыка ж, хлопцы, будзе. Ну і лышча!

Усю ноч над Вісліцай гарэлі вогнішчы. Віліся, як дым, неспакойныя людскія думкі. А раніцой з першымі промнямі сонца застукалі ў дрымучым бары сякеры, ляглі ў вянкі звонкія смалістыя бярвенні.

Вёску назвалі **Лышчам.** А людзям, што прыйшлі сюды, нацярпеўшыся розных прыгод, далі пасля прозвішча — **Прыгодзічы.**



«... Што тычыцца «Новай зямлі», то на розных этапах гісторыі яе ўспрымалі не толькі па-рознаму, але і супрацьлегла, — выказваецца Міхась Канстанцінавіч. — Аднак, бадай, ніхто не прачытаў гэты твор так глыбока і дэталёва, як Алесь Адамовіч. Ён пераканаўча паказаў, што «Новая зямля» — шэдэўр сусветнага ўзроўню, вершаваны раман, які істотна паўплываў на развіццё беларускай прозы». І далей: «Значна менш надаецца ўвагі «Сымону-музыку». Хаця ў свой час выдатны разбор паэмы зрабіў Адам Бабарэка. Вельмі глыбокі разбор, ён і цяпер застаецца адным з лепшых. Глыбокае даследаванне правёў Міхась Мушынскі. Магчыма, новыя пакаленні даследчыкаў будуць знаходзіць у творы нешта новае, актуальнае, сугучнае дню сягоннящняму».

Варта нагадаць, што да збірання ў кнігу дыялогі Зіновія Прыгодзіча з дзеячамі беларускай культуры друкаваліся ў часопісе «Полымя». Кожная з публікацый мела шырокі розгалас сярод чытачоў літаратурна-мастацкага выдання. Дарэчы, у часопісе было надрукавана болей тэкстаў, чым іх увайшло ў кнігу. І тыя дыялогі, што засталіся па-за межамі зборніка, не менеей цікавыя і вартыя ўвагі.

Несумненна, «Постаці...» — з кніг, на якія неабходна звярнуць увагу студэнтам Інстытута журналістыкі Белдзяржуніверсітэта. Зіновій Прыгодзіч паказаў яркі прыклад валодання прафесіяй.

Сяргей Лазоўскі

# Айчыну сілкуюць асобы

Зіновій Прыгодзіч — добра вядомае ў сучаснай літаратуры імя.  Пісьменніка ў большай ступені цікавіла тое, што адбываецца ў вёсцы, якія не толькі сацыяльныя, але і духоўныя змены закранулі вясковага чалавека ў апошнія дзесяцігоддзі. Так і спалучаў літаральна ва ўсе гады Зіно-вій Прыгодзіч у сваёй творчасці пуб-ліцыстыку і мастацкую прозу. Як пуб-ліцыст з вострым пяром, здольнасцю пільна ўглядацца ў жыццё дапаўняў сябе як празаіка. А празаік дапамагаў таленавітаму журналісту ўслухоўвацца ў слова, падказваў вартасці жывой мовы, прыгажосць і трапнасць мастацкіх вобразаў.




Новая кніга Зіновія Прыгодзіча «Постаці: З цэлым народам гутарку весці...» у некаторай ступені можа падацца нечаканым здабыткам журналіста і пісьменніка. Пад адной воклад-кай сабраны творчыя партрэты вядомых, знакамітых дзеячаў беларускай культуры. Яны прадстаўляюць практычна ўс'е сферы нашай культурнай прасторы: літаратуру, тэатр, музыку, жывапіс, скульптуру. Героямі публіцыстычнай кнігі сталі Валерый Анісенка, Міхась Дрынеўскі, Марыя Захарэвіч, Леанід Захлеўны, Адам Мальдзіс, Іван Міско, Міхась Міцкевіч, Георгій Паплаўскі, Янка Сіпакоў, Анатоль Сульянаў.



Сапраўды, вядомасці ў кожнага з гэтых людзей звышдастаткова. Пра іх часта пішуць у друку, яны з'яўляюцца героямі папулярных тэлевізійных перадач. Да герояў кнігі часта звяртаюцца як да экспертаў па тых ці іншых пытаннях, найперш — у сферах іх дзейнасці. Здавалася б, пра такіх персанажаў, чыё жыццё навідавоку, і расказваць лёгка. Ды творчыя партрэты, расповед пра сваіх герояў Зіновій Прыгодзіч вядзе праз інтэрв'ю, гутаркі, дыялогі. Размова пісьменніка з кожным з дзеячаў культуры паасобку ўяўляе сабою выкладанне цікавага, адметнага фактаграфічнага матэрыялу ў жанры, які спалучае ў сабе мастацка-публіцыстычны  інфармацыйны накірункі. Пра сваіх герояў пісьменнік, паўтаруся, расказвае іх вуснамі. Дыялогі са знакамітымі персанажамі ўспрымаюцца як паўнацэнныя дакументальныя, мо нават мастацка-дакументальныя аповеды. Мажліва, гэтаму спрыяе і структураванасць. Возьмем, напрыклад да разгляду дыялог з Адамам Маладзісам— «Беларуская цывілізацыя  мае даўнія традыцыі». Пазнаёміўшы на самым пачатку з героем, вельмі лаканічна абазначыўшы яго «іпастасі» (журналіст, пісьменнік, вучоны, краязнаў-ца, энцыклапедыст, грамадскі дзеяч), Зіновій Прыгодзіч выбудоўвае пытанні Коласа і яго сям'ю, асяроддзе, у якім жыў і працаваў славуты класік беларускай літаратуры. Распытваючы ў сына пра бацьку, Зіновій Прыгодзіч падрабязна распавёў і пра Міхася Канстанці-навіча. І праз гэты дыялог нам адкрыўся чалавек, без якога, як мне асабіста падаецца, партрэт сучаснай беларускай культуры быў бы не поўным. Цікавымі ўяўляюцца і каментарыі Міхася Міцкевіча да Коласавай спадчыны.